# ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА КАНДРАТ ІВАНАВІЧ. ДА 220 ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Выдатны рускі хірург Кандрат Іванавіч Грум-Гржымайла (1794, Магілёў – 1874, Санкт-Пецярбург) з'яўляецца аўтарам першай рускай працы па рэкрэацыйнай геаграфіі (1865), даследчыкам пытанняў выкарыстання рэкрэацыйных рэсурсаў Расіі, курорталогіі.

Скончыў Магілёўскую гімназію (1815), медыцынскі факультэт Віленскага ўніверсітэта (1821). У 1821–1831 гг. служыў хірургам пры штабе 1-й арміі (Магілёў), надрукаваў першае навуковае даследаванне (1829), якое утрымлівала кароткі гісторыка-эканамічны нарыс аб Магілёве. Доктар медыцыны (1823). У 1831–1874 гг. працаваў у Пецярбургу. Папулярызатар медыцынскіх ведаў, выдавец газеты «Друг здравия» (1833–1868). Аўтар шэрагу кніг па медыцыне, у т.л. трохтомнай працы «Руководство к воспитанию, образованию и сохранению здоровья детей» (1843–1845). У 1865 г. Грум-Гржымайла напісаў працу аб курортных багаццях Расіі, у якую ўключыў даведачныя матэрыялы аб вядомых яму замежных курортах.

*У.Г. Хамякоў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова